Дзьмітрый Падбярэзскі



...няма такога ланцуга,

які ўтрымаў бы думку...

# Той, які ўжо нікуды не сьпяшаецца

***Мужчынскае апавяданьне***

Не! У рэшце рэшт, трэба зьбірацца. Трэба хоць бы скрануцца з месца, каб пачаць апранацца. Усё ж, здаецца, вырашана. Трэба ехаць. І гэта ўжо зусім ня той выпадак, калі нехта здольны падказаць, што рабіць. Параіць табе — ехаць ці ўсё ж застацца дома. Ня дасьць рады аніхто, апрача цябе самога. Ты ж сам здаўна усьвядоміў тое. Ва ўсім сьвеце няма нікога, хто б вырашыў лепш. Не, можна, вядома, і пазваніць. Сямутаму. Толькі ня сёньня. Сёньня нікому не пазвоніш. Тэлефон адключаны за няўплату. А гэта значыць адно: сьпяшацца патрэбы няма. Як няма й выбару. Ёсьць толькі крыху часу, каб яшчэ раз падумаць. Таму, хто ўжо супакоіўся. Таму, хто ўжо нікуды не сьпяшаецца.

Значыць, ехаць... Хоць душа супраць. Душа адчувае, што будзе пасьля. Колькі сяброў страціш. Колькі проста знаёмых перастануць цябе пазнаваць. Колькі людзей наогул забудуць твае кніжкі. Назаўсёды і на-

пэўна з лаянкай у твой адрас. Назавуць здраднікам. І гэтае слова будзе адно з нешматлікіх, якія скажуць уголас. Бо нельга ўголас брыдка казаць пра чалавека, які, лічы, памёр. Прычым, на ўласнае жаданьне. Бо ты сам вырашыў: трэба ехаць.

Адмаўляцца зараз ужо тупа. Ты пацьвердзіў прыезд, калі да цябе зьявіліся людзі ад Яго. Ты сам узяў у пракаце смокінг з белай кашуляй і матыльком. Іначай нельга. Ня можа пісьменьнік, якога ведаюць у сьвеце, ехаць на цырымонію ў простым пінжаку. Нарэшце, ты сам набыў на апошнія грошы дзьве пляшкі нейкага там «Водару». Зусім цьвярозы ты й кроку за парогам не зрабіў бы. А так... Заўсёды ёсьць шанц апраўдацца. Маўляў, выпіўшы быў. Вось і вырашыў пасьмяяцца.

Хоць ніхто ў сьмех гэты не паверыць. Ні Ён, ні твае сябры. Нягледзячы на тое, што і Ён, і сябры добра ведаюць, на якія жартачкі ты здольны. Ты, можна сказаць, у гэтай краіне жартаўнік нумар адзін. Хто, як ня ты, падчас жывога эфіру на тэлебачаньні замест сваёй прозы прачытаў «Аддайце песьню нашу нам! Нашто схавалі-расхваталі». Даўно тое было. Больш на тэлебачаньне не запрашалі. А хто, як ня ты, у сакавіку ўпрыгожыў раку трыма дзясяткамі надзіманых шароў, да якіх прывязаў сапраўдных колераў сьцяжкі? Міліцыя так і не пасьпела павыцягваць з вады цагліны, да якіх ты прымацаваў шнуры з шарыкамі. І Ён сам праехаў паўз гэты сьвяточны салют. Кажуць, потым крэслы крышыў у кабінеце. А табе нічога не зрабіў. Ня мог. Бо й тыдню не прайшло, як абвесьцілі пра міжнародную прэмію. Што, кінуць лаўрэата за краты?! Сабе ж даражэй. Ды й за што? Дзе тое напісана, што над рэчкай нельга сьцяжкі ўзьняць?

Хоць, вядома, калі б захацеў, Ён тады б адпомсьціў. Ды адпомсьціў зараз. Датумкаў. Ня сам, зразумела. Ягоныя падручныя. Пры ўладзе ня толькі дурні пасуцца. З сім-тым нават чарку браў некалі, у вочы адзін аднаму пры гэтым глядзелі. І тыя вачэй не адводзілі. Значыць, ва ўладу папаўзьлі сьвядома. Вось і прыдумалі зьдзек. Сапраўдны. Езуіцкі. Ня ўсё ж табе прэміі за мяжой атрымліваць. Гэта проста. А ты атрымай тую прэмію тут. Ды з Ягоных рук. Ды на вачах сотняў людзей. Чужых табе і сваіх. Ого, які плюс Яму! Маўляў, зусім не баіцца, калі супраць Яго кажуць. Дэмакратыя — і ўсё тут! Няхай за мяжой квохчуць, што няма тут свабодаў. Вы ж самі бачылі: прыйшоў, атрымаў, хоць і з апазіцыі. Так бы мовіць, сам у ведамасьці расьпісаўся. Хто пасьля асьмеліцца кусаць таго, хто цябе корміць? Прынамсі, глупа будзе тое рабіць. Таму што ніхто ўжо табе не паверыць. Ні свае, ні чужыя. Аніколі. Бо — кранты!. Ты скончаны. Ты памёр жывым. Роўна ў тое імгненьне, як атрымаеш на грудзі ганаровы знак. І будзе ён сапраўднай цаглінай на шыі. Крыжом на тваім жыцьці. Жыцьці таго, хто ўжо нікуды не сьпяшаецца...

І ў такой сітуацыі найлепш было б пажартаваць. Але вельмі злосна. Вельмі злосна! Напрыклад, застрэліцца на той самай сцэне. Ды хто ж цябе з пісталетам туды падпусьціць? І дзе той пісталет узяць?

Па ўсім атрымліваецца, што іншага выйсьця няма. Тая міжнародная прэмія, зрэшты, ня надта й вялікая, разышлася вельмі хутка. Ты ж ніколі не сядзеў на грашах, як кура на яйках. Кампанію любіш. Частаваць любіш. Лічыш за абавязак падтрымаць маладых. Асабліва паэтак. Хоць і ведаеш, што грошы твае яны прап'юць. Можа, й цябе пры гэтым не згадаюць добрым словам. Ого, якім словам яны цябе згадаюць цяпер! Але грошы ўсё адно возьмуць. Нават калі гэта будуць Ягоныя грошы. Тым большая асалода такія прапіць.

А грошы сапраўды патрэбныя пазарэз. Ты ж пісьменьнік. Ты ня можаш працаваць у нейкай канторы ад і да. Натхненьне ня ведае раскладу. Вось і пішаш сабе. А цябе тут ніхто не друкуе. Хіба што пара-тройка нячэсных газетаў з больш чым сьціплымі ганарарамі. Выдавецтвы? Збор твораў? Дзе там! Некаторыя й рады былі б. Ды толькі вось жыць усім хочацца. Як, зрэшты, і табе самому.

За кватэру вось ужо вінен паўгода. Залаты партсігар у ламбардзе закладзены. Адзіная каштоўная рэч, што зьберагляся ад дзядоў. Яго нельга ня выкупіць. Яго неабходна перадаць таму, хто працягвае род. Таму, пра якога нават былая жонка ня ведае. Але ж ня пойдзеш да яго з кавалкам золата! Няхай і фамільнага. Таксама грошы патрэбныя. Плюс дзьве пазыкі. Пракат смокінгу з матылём. Тэлефон ажывіць. Кавы накупіць, смачнай гарбаты. Абутак паднавіць, адзежу. Нарэшце, проста добра пад'есьці. Ды выпіць не «чарнільца», а нечага такога, каб...

Каб можна было пайсьці да яе. З шыкоўнымі кветкамі. Папрасіць прабачэньня. Пагутарыць цёпла, як гэта раней атрымлівалася. Заначаваць у адным з ёй ложку. І з наступнага ранку — за стол. Пісаць. Заўсёды добра піша той, хто ведае, што нічога нікому ня вінен. Той, хто ўжо нікуды не сьпяшаецца...

Ты ведаеш, што сябры скажуць. Маўляў, на грошы пакваліўся. На брудныя грошы. Цікава, а што б сказаў хто з іх, калі б да яго прыйшлі Ягоныя людзі з весткаю пра ўзнагароду? Сабе яны б казалі тыя ж словы, што й табе? І гэтак жа іх круціла-ламала б? І сумленьне гэтак жа штурхала іх з кута ў кут, сьціснуўшы рукі на тваёй шыі?! Вось чаму ты будзеш казаць ад уласнага імя. І вырашаць толькі за сябе. Гэта няхай Ён вырашае за ўсіх. Ён жа ўсім і адкажа потым. Я — толькі за сябе. Таму і раіцца ня буду. Ні з кім!

Індывід хрэнаў... Яшчэ ня позна адмовіцца. Ня позна здаць смокінг з матылём. Пазычыць у суседкі яшчэ раз. І «чарнільца» набраць. Ды з сырком плаўленым. Каб працяла да глыбіні душы. Каб усё гэта падалося дурным сном. Каб застацца самім сабой...

Ты наліваеш у шклянку. Ідзеш да люстэрка. Глядзіш на сябе. Робіш ладны глыток і зноў глядзіш. Лаўрэат, ха! Дажыўся. Спачатку прызнаньне ў сьвеце. І толькі потым — дома. Такія вось беларусы. Пакуль за мяжой не прызнаюць, на радзіме ва ўпор не заўважаць. Затое ў фаворы тут тыя, хто й мязенцу твайго ня варты. Таму што прынцыповым заўжды нялёгка. Паўсюль. Нават за мяжой. І ўсе пры гэтым разумеюць: цікавасьць да цябе шмат у чым тлумачыцца зусім ня тым, што табой напісана. І як напісана. Проста ты нарадзіўся менавіта ў гэтай краіне. Якая цяпер — як бяльмо на твары ўсяго сьвету. Якой трэба дапамагаць стаць на шлях ісьціны. А пісаў ты заўсёды аднолькава, не зважаючы на тое, што адбываецца наўкол, хто правіць. І толькі сітуацыя прадыктавала тое, што цябе нарэшце заўважылі. Вырашылі падтрымаць сумленьне нацыі, якая асьлепла. Ну што, калі ўжо зусім шчыра? Хіба тая прэмія не была такой жа падачкай? Хіба ты сапраўды гэткі геніяльны? Лепшы з лепшых? Выкусі! Чаму ж тады гэтак не пакутваў? Не вагаўся — ехаць ці не? Во як яно, калі папраўдзе... Тваё здароўе, лаўрэат!

З іншага боку — факты. Тое, чаго не абмінуць. Пераклады на сямнаццаць моваў. Тыражы, якія куды большыя за тое, што выдадзена на мове роднай. Лімузіны да трапу. Шыкоўныя гатэлі. Прыём у прысутнасьці першых асобаў. Смокінг з матылём – бясплатныя. І такія напоі, што...

Пустая шклянка ляціць у кут пакою. Ты ведаеш, што шклянка не паб'ецца. Неаднойчы праверана. Гэта як выпусьціць пару. У сітуацыі, калі не вядома, як і што рабіць.

Цікава, а пасьля цябе будуць надалей друкаваць у тых самых нячэсных газетах? Не адхрысьцяцца, як ад калабаранта? Ці замежная прэмія пераважыць айчынную? І што скажуць у тых газетах, калі пералічыць Ягоную прэмію на іх рахунак? Каб потым атрымліваць такія ж сьціплыя ганарары з уласных жа грошай. Але хто дапаможа падключыць тэлефон?!

Зразумела, заўсёды можна будзе апраўдацца. Маўляў, гэта прэмія не ад Яго. Яна дзяржаўная. І адзначыла цябе дзяржава, а ня Ён. А хто ў нас — дзяржава? Вось табе і нюансік. Яшчэ адзін. І не дзяржава, а Ён працягне табе руку на сцэне. Пры тэлекамерах. І ты мусіш паціснуць тую руку, хоць раней нават падумаць пра гэта ня мог... Ды што там рука! Куды вочы потым падзець? Асабліва ад сына. Калі той на сабе на плошчы зьведаў, што такое гумай ды па нырках, што такое набітая людзьмі камера. Для сына ты пакуль герой. Але да таго моманту, як пацісьнеш тую руку. Далей — цемра. Без працягу роду.

Бач ты, што прыдумалі! Абклалі сьцяжкамі. Адно выйсьце й пакінулі. Маўляў, калі ласка! Клетка гатовая. І з усімі выгодамі. Поўны збор твораў — па-за планам. Сустрэчы з чытачамі ў лепшых залах. Тэлебачаньне, радыё. Інтэрв'ю для тоўстых і пустых часопісаў. Ганаровая пасада ў якой канторы з ладным заробкам. І на заканчэньне — некралог ва ўсіх газетах. З усімі подпісамі. З Ягоным прозьвішчам. Як належыць. І мемарыяльная дошка. І пахаваньне з помнікам за дзяржаўны кошт. Ды ўсё гэта — з цяжкім ланцугом на шыі. І ключы ад замка на ланцугу згубленыя назаўсёды. Ад цагліны на шыі таго, каму сьпяшацца ўжо няма як...

А што, ня так?! Ці ня тое самае з Купалам было? Можа, яго таксама змушалі зрабіць нешта такое, праз што ён пераступіць проста ня мог? Што рука, якую ён мусіў паціснуць, была такая ж? Вось і вырашыў зьбегчы ў нябыт такім, якім быў. Застаўся самім сабой. І цяпер ніхто пра яго дрэнна ня скажа. Хоць такі зыход — ня лепшы чын.

Ты глядзіш на гадзіньнік. Застаецца ўсяго чвэрць гадзіны, як прыйдзе дагледжанае аўто. Застаецца ўсяго нічога, каб вырашыць далейшы лёс. Можна, безумоўна, выскачыць на ганак у тым, што ёсьць. Драныя джынсы, лаплены швэдар, старыя пантофлі. І — на тры нелітаратурныя літары! Вось так! Тройчы па тры літары! І пасьля дапіць «чарнільца» з лёгкім сэрцам. Чыстай душой. А можна паехаць. І выйсьці на сцэну па той значок. І не заўважыць працягнутую руку. І на фуршэце ўжо даць сабе волю. Небясьпечна жартаваць, як ты гэта ўмееш. Чапляцца да калгасных жонак бліжэйшага Ягонага атачэньня. Можна будзе! Дзяржаўнаму лаўрэату дазволена. І напрыканцы забраць са стала бутэльку дарагога пітва, «зьняць» прыгожую афіцыянтку і адвезьці яе да сябе. Ня як Яго пазаштатнага супрацоўніка, а як жанчыну. Калі яшчэ будзе нагода памілавацца, вылузаўшыся са смокінгу! І няхай яна потым схлусіць у справаздачы, што тая ноч прайшла для яе дрэнна. Глупства! Хто паверыць?!

Дзесяць хвілінаў... Ён скідае джынсы, швэдар. Зноў глядзіцца ў люстэрка. Ну, патрыманы ўжо. Ну, не маладзён. Ну, ужываны рознымі і неаднойчы ва ўсе дзіркі. А калі вось так? Белая кашуля. Смокінг. Матылёк. Бліскучыя чаравікі. Іншая справа! Да ансамблю не хапае толькі лаўрэацкага значка. Для поўнага шчасьця таго, хто ўжо нікуды не сьпяшаецца.

Таму што ты ўсё вырашыў. Паедзеш. Выйдзеш на сцэну, калі пачуеш сваё прозьвішча. Халера з ёй — пацісьнеш тую руку. Нічога, будзе як адмыцца. Бо жарцік прыдуманы. Ты падыдзеш да мікрафону і запрапа-

нуеш усім калегам па шчасьці пералічыць грошы на будаўніцтва помніка Яму. Прападаць — дык з музыкай! І хрэн хто запярэчыць!

І з трансьляцыі такое выразаць ніхто не адважыцца. Сам Ён, зразумела, будзе няшчыра адмаўляцца. Бо адразу ж зразумее: прайграў. Трапіў у дурную сітуацыю. З Яго адкрыта насьмяяліся. Ды так, што найбольш рагочуць людзі з бліжэйшага атачэньня. Адно што жонкі калгасныя нічога не зразумеюць. Ды ўжо прабачце! Не на вас жарцік разьлічаны.

Пяць хвілінаў... Паліто апранаць сорамна. Старое занадта. Узяць трэба на ўсялякі выпадак. А што, калі давядзецца назад на трамваі? Трамвай і смокінг — рэчы несумяшчальныя. Так, яшчэ паўшкляначкі хіміі, што віном завецца... Цыгарэта. Запальнічка. Разьвітальны погляд у люстэрка. І ўніз па сходах. З паліто праз руку. Да бліскучага чорнага аўто, якое вурчыць ля ганку, як сыты кот.

Цэнтральная зала ў агнях. Паліто пакінутае ў машыне. Па чырвоным дыване да цэнтральнага ўваходу цябе суправаджаюць мажнога складу хлопцы. Людзі апладзіруюць табе, як якой кіназорцы. На ўваходзе ветліва просяць прайсьці праз металічную брамку. Зьвініць сігнал. Ты абмацваеш кішэні, знаходзіш запальнічку. Узамен атрымліваеш нумарок. Цябе вядуць далей, у залу за сцэнай. Там зьбіраюць лаўрэатаў прэміі. Ты пазнаеш мастака, які ўсё жыцьцё малюе ўласную жонку. Кінарэжысёра, які брудна здымае заказныя фільмы. Журналістку, якая ўтрапёна піша пра Яго з тым жа піетэтам, з якім пісала пра Ягонага папярэдніка. Гісторыка, які штораз перапісвае кнігі ў залежнасьці ад таго, што скажа Ён. Сьпевака, які неяк заявіў, што на беларускай мове песьні гучаць немілагучна. Загадчыцу бібліятэкі, якая першая ў краіне добраахвотна ачысьціла збор ад «дрэнных» пісьменьнікаў. Ты ведаеш, што сярод кніг, сьпісаных на макулатуру, былі і твае. Нарэшце, ты бачыш актора і спыняеш на ім позірк. Ох, як той некалі чытаў Купалу! Жанчыны плакалі, у мужчынаў міжволі сьціскаліся кулакі, юнакі былі гатовыя рушыць муры.

Ты прывітаўся, нягледзячы на тое, што кампанія радасьці не давала. Ты ніколі не адчуваў сябе такой белай воранай, як сёньня. Хацеў закурыць, але замест запальнічкі намацаў нумарок. Праз пару хвілінаў вам растлумачылі, як паводзіць сябе падчас цырымоніі. Што можна рабіць і чаго не. Потым вывелі на сцэну, падраўнялі і пад гучаньне аркестра адчынілі заслону. Зала ўскочыла з крэслаў, вітаючы Яго. Ён распавёў пра дасягненьні айчыннай культуры, яе перспектывы, склаў пажаданьні творчай моладзі. На заканчэньне прыгразіў тым сілам, якія замінаюць краіне ісьці па вызначаным Ім шляху. Нарэшце, пачаў уручаць узнагароды.

Ты стаяў перадапошні. Цябе ахапіў нейкі азарт у прадчуваньні, можа, лепшага жарту ў жыцьці. Зараз, зараз ты пацісьнеш руку і скажаш у мікрафон тое, што прыдумаў. Вось яшчэ хвіліна, пасьля гэтай журналісткі...

Як у забыцьці, ты пачуў яе голас. І не адразу зразумеў, што яна сказала. Нешта пра падзяку асабіста Яму, Ягонаму клопату пра творчых людзей, агульнае іх меркаваньне пералічыць прэмію... Хто ёй тое сказаў? Які Фонд міру?!

«Тваю маць!» — пачулася збоку. Ты азірнуўся. Твар старога актора дрыжаў, у ягоных вачах стаялі сьлёзы. Ты сам міжволі намацаў шыю, якую матылёк сьціснуў, быццам металічны ланцуг з цаглінай на канцы. «Прадаўся, — мармытаў актор. — Дык хаця б за грошы. А то — за катлету на фуршэце»...

Далейшае прайшло як у тумане. Ты ня памятаеш, якія рукі паціскаў. Спустошана нешта казаў у тэлекамеру. Стаіўся ў куце залы для прыёмаў,

сьціскаючы фужэр з вадой. Абы не раздушыць! Потым бачком незаўважаны праціснуўся да выйсьця. Табе нагадалі пра запальнічку. Выйшаў на вуліцу і сарваў матылёк. Шпурнуў цагліну ў мокры сьнег. Адразу задыхалася вальней. Ад машыны наблізіўся кіроўца і павіншаваў з узнагародай. Ты прамаўчаў. Кіроўца спытаў:

— Дзе можна набыць вашую кнігу?

— Зайдзіце на днях. Падпішу.

— Дык давайце ў машыну.

— Я сам, як-небудзь. Трамваем, — адказаў ты.

На вуліцы дыхалася свабодна і глыбока. Накінуў на плячо паліто і нясьпешна крочыў, падстаўляючы твар дробным кроплям дажджу. На дзіва, лаўрэацкі значок зусім не абцяжарваў грудзі. Яму было сьмешна. Да сьлёз. І думаў ён пра адно. Няўжо ня вернуць грошы за смокінг з матылём, калі ён заявіцца да іх з тым значком?

З падваротні на яго маўкліва высунуліся двое.

— Мужык, грошы якія маеш? — спытаў адзін.

Ён моўчкі выцягнуў з кішэні камяк паперак. Усё, што меў на далейшае жыцьцё.

— Во і добра! — сказаў другі. — Пайшлі!

Ён згодна пасунуўся за імі ў цемру.

У двары адзін мужчына даў яму пластыкавы кубачак і кавалак плаўленага сыру, другі тым часам падзяліў на трох пляшку “чарнільца”. Падумаўшы, сказаў:

— Мужыкі, давайце вып’ем за тое, каб нам ніколі ня лётаць на паўднёвакарэйскіх самалётах.

Яму ніхто не адказаў. Яны, не адрываючыся, высмакталі пітво, закусілі і пакідалі кубкі на зямлю.

— Дзякуй за кампанію, — сказаў ён.

Яму далі цыгарэту бяз фільтру, і ён пакрочыў дамоў. У галаве круцілася. І ад выпітага таннага віна, і ад моцнага тытуню. І ад усьведамленьня таго, што лепш, чым як сталася, скончыцца вечар ня мог.

“Блін, ды ня лётаюць да нас тыя самалёты!” — думаў ён. І не заўважыў, як пачаў сьмяяцца. Спачатку сам сабе, потым ціха, напаўголасу. Праз колькі крокаў ён ужо рагатаў так, што рэдкія мінакі кідаліся ад яго, быццам вераб’і з-пад колаў шпаркай таксоўкі.

“Жыцьцё — добрая штука, — думаў ён. — А заўтра — гэта ўсяго толькі заўтра. Вось заўтра і пабачым, што і як. А сёньня — гэта маё сёньня. І нічыё больш. Заўтра ж я буду рабіць сваё заўтра. Пакажыце таго, хто мне ў гэтым перашкодзіць. Я тады буду сьмяяцца, як сьмяюся цяпер. Я стаміўся баяцца. Цяпер няхай Ён баіцца мяне. Свайго лаўрэата. Бо не прыдумалі яшчэ такога кароткага ланцуга. Няма такога ланцуга, які ўтрымаў бы думку. А таму — Ты ўсё ж пралічыўся. Бо сам закуты ў ланцуг. Куды больш строгі і моцны”.

Чалавек у бялюткай кашулі, смокінгу з матылём і паліто праз плячо шырока крочыў па вуліцы. Ён ведаў, што будзе з ім у бліжэйшы час. Паўднёвакарэйскі самалёт, канешне ж, рана ці позна прыляціць. Але білет на гэты рэйс ён пакуль замаўляць не зьбіраўся.

Прынамсі, заўтра — дакладна.

*P.S.* У канцы апавяданьня выкарыстаны расповяд, пачуты аднойчы ад Уладзіміра Някляева.